УДК 372.828.2

**Сяргей Аношка**

# Праблематыка выкладання тэматыкі новае рэлігійнасці: каталіцызм і саенталогія

**Сергій Аношко**

**Проблеми викладання нової релігійності: католицизм і саєнтологія**

Представлено роздуми про проблеми викладання курсу нових релігійних течій у католицьких школах та університетах. Труднощі полягають у невідповідності понятійно-термінологічного апарату, який використовується у школах та вишах, реальному змісту постмодерних релігійних течій. Визначено головне завдання викладача, який займається проблематикою нової релігійності – активізувати фокус критичного мислення учнів з метою розвитку навичок виділення істотних і менш важливих ознак релігії. Приділено увагу методиці викладання курсу з релігієзнавства, яка спрямована на виховання у молоді критичного підходу до читання оригінальних текстів і порівняння їх з полемічними текстами дослідників, а також зіставлення їх зі своєю власною релігійною традицією.

*Ключові слова*: католицизм, культ, методологія, саєнтологія, секта, педагогіка, проблема термінології

**Siarhei Anoshka**

**The problems of teaching new religions: Catholicism and Scientology**

Reflections on the problems of lecturing of the academic course of new religious movements in Catholic schools and universities are presented. The difficulties lie in discordance between concepts and terms used in schools and universities and the real meaning behind postmodern religious movements. The main task of a teacher who has been engaged with the issues of the new religions is determined. It is to intensify focus of students' critical thinking with the purpose of developing skills for distinguishing of essential and less important aspects of religion. Attention is paid to the methodology of teaching of religious studies, which aims to educate in young people a critical approach in reading of original texts, comparing them with polemical texts of researchers and their own religious tradition.

*Keywords:* Catholicism, cult, methodology, Scientology, sect, pedagogy, problem of terminology

Цягам апошніх некалькіх дзесяцігоддзяў тэма новае рэлігійнасці, культаў і сект стала адной з цэнтральных у сацыялогіі й тэалогіі рэлігіі. У сувязі з гэтым нарадзілася неабходнасць правільнага падыходу да выкладання і прадстаўлення гэтай тэматыкі падчас навучальнага працэсу. Якім чынам сучасная каталіцкая педагогіка і катэхэтыка павінны адносіцца да новых рэлігійных рухаў? Якой трэба ўжываць тэрміналогіі,

дзеля таго, каб не абразіць суразмоўцаў, але разам з тым, каб захаваць сваю хрысціянскую тоеснасць і свядомасць? Усе гэтыя пытанні даволі важныя і патрабуюць своечасовага адказу, бо менавіта ад правільнае пастаноўкі пытанняў і, у адпаведнасці, адказу на іх залежыць нашае агульнае бачанне гэтае праблематыкі. На прыкладзе аднаго з такіх новых рухаў, які па сутнасці ўжо займеў статус дэнамінацыі [1, с. 97] – Царквы саенталогіі – паспрабуем прасачыць і апісаць стаўленне Каталіцкае царквы да неакультаў у галіне канфесійнага навучання маладога пакалення вернікаў.

Даволі доўгі час у пытанні новых рэлігійных рухаў (далей НРР) існавалі пэўныя перакосы, так званыя «рэлігіі новага веку» будзілі недавер, а нават страх, што, безумоўна, уплывала таксама на тое, якім чынам яны былі прадстаўленыя ў кнігах і падручніках «старых» рэлігій. Відавочна, што таксама як й у асяроддзі навкоўцаў ды знаўцаў тэматыкі, у той самы час адбываецца ажыўленае абмеркаванне дадзенае тэмы сярод звычайных грамадзян, якія штодзённа сутыкаюцца з новымі рэлігіямі ў сваім жыцці, апасродкавана праз медыя ці нават асабіста ў часе індывідуальных кантактаў з прадстаўнікамі тых груп. Не трэба асабліва здзіўляцца, што згаданы грамадскі дыскурс знаходзіць сваё адлюстраванне таксама ў акадэмічным асяроддзі, што пазней праяўляецца ў выглядзе тых ці іншых падыходаў да вывучэння новых рэлігіяў.

Такім момантам у навуковым падыходзе да вывучэння і займавання новымі рухамі стаў сумнавядомы момант з гісторыі царквы Джыма Джонса «Храм Народаў», фундаментальнае парахрысціянскае групы, чальцы якой у 1978 г. скончылі сваё жыццё самагубствам (пэўная частка зрабіла тое не па сваёй волі, але толькі была змушаная). У 1982 г. амерыканскі гісторык рэлігій Джонатан Сміт (Jonathan Zittell Smith), які між іншым займаўся даследваннем масавага суіцыду ў Джонстаўне, у сваёй працы Imagining Religion: From Babylon to Jonestown заўважыў, што менавіта зараз надыходзіць той час, калі навуковае даследванне разам з акадэмічнае рэфлексіяй над праблематыкаю новых рэлігійных рухаў павінны браць пад увагу веліч і значнасць гэтага феномену, альбо ўвогуле перастаць тым займацца. Пры гэтым аўтар дакладна размежаваў галіны даследвання рэлігіі, маўляў, існуюць два магчымыя паралельныя падыходы: гуманістычны свецкі падыход ды тэалагічны канфесійны [2, с. 103].

Страх адносна новых рэлігій пашырыўся яшчэ больш значна пасля падзей у Тэхасе ў 1993 г., калі ў выніку канфлікту з уладамі і ФБР загінулі некалькі дзясяткаў чалавек з групы Давіда Корэша «Галіна Давідава». Тыя падзеі былі заўважаныя нават на дзяржаўным узроўні: Дэпартаментам Юстыцыі ЗША быў прыняты адпаведны дакумент і прапанаваны на разгляд ураду краіны [3, с. 1–3]. Усё ўзгаданае вышэй не магло не паўплываць таксама на педагагічны каталіцкі канфесійны падыход да новых рэлігійных аб’яднанняў.

Выкладанне курсу пра новыя рэлігіі ў каталіцкіх школах і ўніверсітэтах мае амбівалентны характар: з аднаго боку мы можам мець дачыненне з цікаўнасцю навучэнцаў да праблемаў звязаных з іх уласнымі духоўнымі турботамі й абавязкамі, але з іншага боку, вельмі спецыфічныя формы і праявы новае рэлігійнасці ды практыкі неакультаў могуць выклікаць непаразуменне, здзіўленне, а нават брак ахвоты да займавання «дзіўнымі» верваннямі [4, с. 29]. Дзеля таго, каб заангажаваць навучэнцаў ці студэнтаў у дыскусію, прысвечаную апісаным пытанням, варта звярнуць увагу на ўжо вядомыя чыннікі, якія могуць быць базісам і момантам выйсця для правядзення рэфлексіі. З мэтаю большага аб’ектывізму будзе неабходным абаперціся на ўласную рэлігійную традыцыю з мэтаю зразумець іншых, часам так істотна розных ад нас, прадстаўнікоў новых дэнамінацый. Таму, здаецца, слушным будзе выглядаць падыход, да якога ўсё часцей сягаюць каталіцкія (але й не толькі яны) тэолагі, а менавіта да методыкі кампаратыўнага падыходу да аналітычнага параўнання.

Ужо ад самага пачатку паўстае пытанне, як належыць назваць прадмет нашага даследвання, бо існуе багата розных прапановаў, якім чынам ставіцца да новых і альтэрнатыўных рэлігійных рухаў. Бо, напрыклад, калі ўжываем даволі папулярнае і распаўсюджанае назвы «секты і культы», можа тое выглядаць даволі аднабакова, а нават спрэчна, у выніку чаго агульнае разуменне дадзенае рэлігійнае катэгорыі будзе падважана. Само слова «культ» вельмі неадназначнае: маем безліч даследванняў даволі сур’ёзных і аўтарытэтных навукоўцаў з галіны тэалогіі і рэлігіязнаўства, што наўпрост у сваіх працах падаюць культы як псеўдарэлігіі, што стасуюць «пранне мазгоў» ды маніпуляцыю, каб толькі адвесці ад «праўдзівае» веры [5, с. 314]. З іншага боку, не бракуе і такіх, хто з захапленнем вітае з’яўленне на рэлігійным небасхіле ўзгаданых груп, якія мусяць быць жывым доказам адыходу скаснялых

старых традыцыйных сістэмаў, што ўжо аджылі сваё і павінны вызваліць месца новым рэлігіям [6, с. 2]. Не павінны мы забывацца й на тое, што, насуперак вядомае старажытнае сентэнцыі tertium non datur, існуе трэці магчымы шлях: спроба халістычнага падыходу пры магчыма шырокім аглядзе ўсіх існуючых аспектаў, як тое прадстаўлена ў працы прафесара каталіцкага ўніверсітэту Detroit Mercy езуіты а. Джона Салібы (John A. Saliba SJ), дзе ён спрабуе прэзентаваць прымірэнчы падыход да вывучэння і выкладання тэорыі новых рэлігійных рухаў [7, с. VII–X]. Больш таго, праф. а. Дж. Саліба SJ дакладна паказвае, што, каб размаўляць пра новыя рэлігіі, мы дакладна павінны зразумець, у прызме якіх дэфініцый мы будзьма весці свае даследванні – тэалагічных/рэлігійных, псіхалагічных ці сацыялагічных [7, с. 2–8].

Сённяшні каталіцкі падыход да навучання павінен перадусім базавацца на ўласцівае метадалогіі ды інструментах, што будуць ужытыя навучэнцамі і студэнтамі пры разглядзе, у нашым выпадку, дактрыны, культу і рытуалаў Царквы саенталогіі. Такая методыка мусіць выхаваць у маладзёнаў крытычны падыход у чытанні арыгінальных тэкстаў і супастаўленні іх з палемічнымі тэкстамі даследчыкаў, аналітычную ўважлівасць да «рэлігійнага» (так званая «здаровая рэлігійнасць»), але таксама й парарэлігійнага кантэнту, прысутнага ў навучанні НРР. Дыскусія пра рэлігійны альбо свецкі характар саенталогіі вядзецца амаль ад самага пачатку існавання згаданае групы Хабарда [1, с. 77–78]. Таму некаторыя моманты становяцца больш вострымі і лягчэйшымі да ўсведамлення, калі ў дыскурс мы ўвядзем вядомыя нам «стабільныя» пастулаты са сваёй уласнай рэлігійнай традыцыі, што ў самім залажэнні павінна дапамагчы зразумець найважнейшыя элементы культу і дактрыны абранае намі групы.

Пры працы з тэматыкаю НРР пачынаем ад высвятлення агульнага стану ведаў маладзёнаў у акрэсленым абшары. Ёсць тое неабходна, бо дазволіць ужо на пачатку высветліць, на якім узроўні знаходзіцца аўдыторыя, з якой давялося нам працаваць. Зазвычай моладзь дэманструе агульную абазнанасць у тэматыцы, але разам з тым іх адказы часцяком нагадваюць завучаныя раней ці пачутыя з мас-медый штампы наконт НРР. Так, сярод адметных характэрыстык вышэйназваных груп падаюцца дзіўныя вераванні і практыкі, «прамыванне мазгоў» [8, с. 6], прымус і фінансавыя скандалы (асабліва, што тычыцца саенталогіі,

якая даўно з гэтае нагоды не мае добрай прэсы [9, с. 133; 10, с. 232]), сляпое падпарадкаванне, кантроль за вернікамі [1, с. 96], наяўнасць аднаго харызматычнага лідэра і г.д. [5, с. 255]. Часам у публіцыстыцы можна натрапіць на пэўны рэтраспектыўны позірк, калі стасуецца прыём прыгадвання факту, звязанага з дзейнасцю злачынных ці махлярскіх арганізацый, у тым ліку рэлігійнага кшталту, з параўнаннем разглядаемага руху да тых жа груп [11, с. 13].

У той самы час багата адметных рысаў, уласцівых менавіта саенталогіі, звычайна не заўважаюць, бо ўвагу адцягвае медыйны вобраз дадзенае групы, які стварылі між іншым Т. Круз і Дж. Траволта – найбольш знакамітыя вызнаўцы новае рэлігіі, якія ў СМІ часам нават называюцца «апосталамі» гэтае веры [12, с. 66]. Не дапамагаюць у працы выкладчыка і папулярныя сярод моладзі серыялы, кшталту South Park (укр. Південний Парк), дзе пэўныя тэзы наконт Царквы Хабарда маюць ападыктычны і апрыярычны характар [13, с. 169], альбо The Simpsons (укр. Сімпсони), дзе голасам аднаго з герояў, Барта, «размаўляе» высокапастаўленая ў іерархіі саентолагаў Нэнсі Картрайт (Nancy Cartwright), што можа падважаць сур'ёзнае ўспрыманне феномену новае рэлігіі [14, с. 10].

Дзеля таго, каб зрабіць агульныя ўводзіны ў тэматыку, як раіць тое рабіць М. Шмальц [4, с. 30], можна запрапанаваць уводны фільм уласнае вытворчасці Царквы пад назваю Dianetics (укр. Діанетика), дзе даюцца падставы інфармацыі пра структуру чалавечага розуму і тыя праблемы, што з тым звязаныя (пазней, калі ў 1954 г. у Вашынгтоне Хабард зарэгіструе першую саенталагічную царкву, дыяенетыка «ўвойдзе» ў склад саенталогіі як асобная методыка [15, с. 276]). Паводле саенталагічнага навучання, чалавечы розум уяўяле з сябе «слаёны пірог» з трох частак: розум саматычны, рэактыўны і аналітычны [16, с. 67–73]. Менавіта ў рэактыўным утрымліваюцца энграмы – пэўныя моманты звязаныя з кепскім станам здароўя, болем, злымі ўспамінамі, станамі непрытомнасці і г.д., што перашкаджаюць нам быць вольнымі, шчаслівымі і бадзёрымі, замінаюць чалавеку рухацца да духоўнага вызвалення [5, с. 11]. Усе гэтыя энграмы маюць быць ачышчаныя (англ. clear) пры дапамозе тэхнікі одытынгу (англ. auditing), што праводзіць спецыяльна падрыхтаваны да таго чалавек – одытар.

Ужо сама гэтая прэзентацыя альтэрнатыўнае антрапалогіі чалавечага мозгу можа быць прычынаю кантэстацыі феномену дадзенага

НРР. У такія моманты вельмі важна падкрэсліць тое, пра што піша праф. а. Дж. Саліба SJ: дэфінітыўную розніцу ў падыходзе да з’явы новае рэлігійнасці. З пункту гледжання псіхалогіі наўрад ці атрымаецца лагічна вытлумачыць існаванне трох частак чалавечага розуму, пра якія піша Рон Хабард. Нас больш павінен цікавіць тэалагічны аспект: сама магчымасць уплыву на чалавечае мінулае пры дапамозе адпаведных практык [1, с. 92]. Тэалогія, выходзячы ад Аб’яўлення прынесенага Езусам, звяртае ўвагу на дзве рэчы – артадоксію і артапраксію [7, с. 167], тыя два моманты з’яўляюцца дзвюма адметнасцямі таксама й у саенталагічнае дактрыне.

Тут выходзяць галоўныя стычныя моманты, паводле якіх і будзе адбывацца параўнанне: па-першае, галоўнае прасачыць, ці саенталогію можна называць рэлігіяй? Бо для хрысціянаў важным з’яўляецца духоўны кампанент, а не столькі рытуалы і практыкі; адказ можа быць станоўчым, бо саенталогія навучае пра духоўную структуру чалавека, уводзячы ў тэрміналогію паняцце Тэтан (ён жа дух) [16, с. 65]. Па-другое, на што павінен звярнуць увагу тэолаг, гэта тое, ці прысутнічаюць нейкія моманты ў рытуалістыцы, што могуць прыгадаць хрысціянскую традыцыю, і ці могуць быць тыя элементы гарманічна дапасаваныя, асцярагаючыся рэлігійнага сінкрэтызму. Адказ: так, часткова, бо практыка сеансу одытынгу па сваёй структуры аддалена, але нагадвае сакрамэнт споведзі, пра што ў публікацыях пішуць самі вызнаўцы новае веры [17, с. 96].

Нельга абмінуць таксама справы пастаральнага кшталту, то бок прысутнасці новае рэлігійнасці ў паўсядзённым жыцці вернікаў традыцыйнае канфесіі, а таксама ўплыў новых рэлігійных поглядаў на духоўны стан гэтых людзей. Якім чынам трэба падрыхтавацца да магчымага ўцягвання чальцоў сям’і ва ўлонне НРР, як павінны зарэагаваць катэхэты і настаўнікі рэлігіі, ці НРР з гэтае прычыны з’яўляюцца нашымі ворагамі ex definitione?

Працуючы са студэнтамі важна будзе прапанаваць ім да разгляду некаторыя тэарэтычныя выкладкі і «сухі» рэлігіязнаўчы аналіз, як, напрыклад, тое робіць у сваёй працы Дж. Гордан Мэлтан (J. Gordon Melton), даследчык НРР з універсітэту ў каліфарнійскае Санта-Барбары. Ён застасаваў вельмі простую методыку – канфрантацыю праўды з рэчаіснасцю, параўноўваючы матэрыялы на тэму саенталогіі, размешча-

ныя ў сеціве WWW, разам з тым, што запісана ў саміх «саенталагічных катэхізмах». Даследчык імкнецца заставацца аб'ектыўным, але падае таксама пэўныя адмоўныя і непрыемныя моманты, звязаныя з саенталогіяй [18, с. 196–199], і менавіта з гэтае нагоды можа быць цікавы, а ягоныя працы карысныя для выкарыстання падчас навучання ў тым ліку таму, што аўтар дакануе селекцыі на першакрыніцы, літаратуру прадмету і творы крытыкі.

Безумоўна, што значна большую ўвагу моладзі прыцягваюць матэрыялы сенсацыйнага характару, кшталту апублікаванага навесну 1991 года ў часопісе Time Magazine дасье пра маніпуляцыі і фінансавыя справы рэлігійнае групы [19]. Такую зацікаўленасць даўно ўжо заўважылі й у самім асяроддзі тэолагаў, прысвячаючы акрэсленае тэматыцы шэраг прац і публікацый, у тым ліку даволі крытычных. Асноўная маса іх звязаная з народнаю пабожнасцю, калі рэлігійныя пачуцці будуюцца не столькі на падставе веры ці містычнага дасвядчэння сувязі з sacrum, колькі эмоцыяў, народнае традыцыі і мясцовых забабонаў [20, с. 146].

Безумоўна, методыка псіхааналітычнага выкрыцця прычынаў рэлігійнасці [21, с. 16–18], у тым ліку ў дачыненні да НРР [5, с. 96–97], даволі моцна крытыкуецца апошнім часам сярод навуковага кола даследчыкаў рэлігіі, бо падважае асновы самой веры, адводзячы ёй месца толькі і выключна пэўных механізмаў саматычнае натуры ў нашае псіхіцы і свядомасці [22, с. 100], няма тут збліжэння з sacrum, пра што кажуць фенаменолагі рэлігіі [23, с. 67]. Вельмі часта, у тым ліку пры крытыцы каталіцызму, звяртаюць увагу менавіта вось на такія знешнія чыннікі, якія, відавочна, не з'яўляюцца неадрыўным атрыбутам рэлігіі як сістэмы вераванняў. Варта адказаць на важныя пытанні: ці з'яўляецца той НРР культам толькі таму, што мае адметную рэлігійную практыку, ці таму што для некаторых з нас тыя практыкі і дактрыны выглядаюць абсурдна?

Галоўнай задачай выкладчыка, які займаецца праблематыкаю новай рэлігійнасці, менавіта й з'яўляецца тое, каб актывізаваць фокус крытычнага мыслення навучэнцаў з мэтаю развіцця навыкаў вылучэння істотных і меней важных прыкметаў рэлігіі ўвогуле і канкрэтнага руху ў прыватнасці.

Параўнанне новых рэлігій з існуючымі ўжо даўно сістэмамі вераванняў здаецца быць не вельмі лёгкаю задачаю, перадусім таму, што цяжка

знайсці чыннікі, што катэгарычна будуць вызначаць НРР у якасці «дэвіантнае групы» ці «нармальнае веры». Можа быць нязручнасцю таксама тэрміналогія, якая намі выкарыстоўваецца для апісання феномену НРР: з аднаго боку, слова «культ» даволі нейтральнае, а разам з тым у заходнееўрапейскіх акадэмічных колах мае тыя ж самыя негатыўныя канатацыі, кшталту назоўніка «секта», якім часцяком карыстаюцца навукоўцы постсавецкае прасторы, а таксама прадстаўнікі навуковых асяродкаў з Цэнтральна-Ўсходняе Еўропы.

З такога пункту гледжання саенталогія можа быць акрэслена тэрмінам «культ», бо іх культавая практыка одытынгу можа нам выдавацца некарыснаю, а часам нават мець рысы маніпуляцыі [5, с. 21–22]. Калі ж глядзець халістычна на саенталогію, таксама можна прыйсці да высновы пра яе ірацыянальнасць ці нават ілжэхарактар. Й зноў, з пункту гледжання псіхааналітычнага аналізу, марыйны культ, які так шырока прапагаваны і развіты ўва рыма-каталіцызме, таксама можа камусьці нагадваць не больш, чым прадукт чалавечае псіхікі, і тое не заўсёды здаровае, як пра тое было сказана вышэй.

Дадзены момант у працэсе навучання і выкладання адпаведнага матэрыялу можа быць выкарыстаны ў якасці палемічнае методыкі, дзеля таго каб заахвоціць вучняў і студэнтаў больш глыбока паразважаць над прыродаю рэлігіі, каб знайсці атрыбутыўныя рысы, якія будуць уласцівыя ёй без звяртання ўвагі на час паўстання, а значыць, і для НРР таксама. Істотна тое таму, бо дазваляе нам сфармаваць базу і падмурак для дыялогу і нейтральнага падыходу да канкрэтнага феномену, які мы даследуем. Безумоўна, цяжка адыйсці ад суб'ектывізму ці ўласнага пункту гледжання [1, с. 81], але так распачатае даследванне дазволіць пазбегнуць пэўных загадзя ўсталёных рамак і межаў, дазволіць зрабіць навуковыя ацэны выразнымі, а аргументацыю пераканаўчаю й доказнаю.

Усё вышэй адзначанае цалкам не азначае, што мы не можам і не павінны абмяжоўваць сябе пры выкарыстанні багацця тэрміналагічных дэфініцыяў ці азначэнняў пры працы з НРР. Наадварот, усвядомленая і добра аргументаваная пазіцыя дазваляе даследчыку свабодна карыстацца рознымі дэсыгнатамі, у тым ліку такімі як «секта» ці «культ». Безумоўна, заўсёды варта памятаць пра падмурак, які мы закладаем пад тыя азначэнні, калі ўводзім тыя словы ў нашыя тэксты артыкулаў ці

публікацый. Дакладна вядома, што ў свядомасці масавага чытача слова «культ» будзе атаясамлівацца з сацыяльна непрымальнымі паводзінамі, якія могуць загражаць не толькі жыццядзейнасці саміх ўдзельнікаў рэлігійнае групы, але таксама й усяму грамадству. Такія прыклады вядомы з гісторыі рэлігій, а асабліва НРР, таму ў тых выпадках смела можам карыстацца тым назоўнікам.

Варта здаваць сабе справу з таго, што пэўныя аздобнікі, якія ў навуковым ці акадэмічным дыскурсе маюць нейтральную характарыстыку, у той самы час могуць быць зусім інакш трактаваныя ў масавае свядомасці. У такой сітуацыі акцэнт робіцца перадусім на ірацыянальнасць дактрыны (хаця сама рэлігія па сваёй сутнасці наўрад ці можа быць названа рацыянальным сацыяльным інстытутам [1, с. 79], інакш не была б увогуле патрэбна вера, калі б усё можна было лагічна вытлумачыць за дапамогаю толькі і выключна сродкаў нашага розуму; паняцце пра Бога не паддаецца рацыянальнае думцы [4, с. 33]), а таксама карыстанне са сродкаў прымусу ў навязванні сваіх поглядаў іншым людзям, ці так званы празелітызм. Акцэнт залежыць таксама ад прынятага боку: пэўныя дэфініцыі могуць падыходзіць толькі да групаў НРР [24, с. 331–332], бо падкрэсліваюць іх адметны характар, у той самы час як іншыя могуць быць застасаваныя ў тым ліку да традыцыйных рэлігій, і тады нават каталіцызм можа быць названы культам [25, с. 81], што здаецца нам быць падыходам неўласцівым і неаргументаваным, хаця, маўляў, таксама маючым права на існаванне.

Метадалагічна безумоўна можна звесці дадзеную тэматыку выключна да рацыянальнага падыходу, тады ўжо не будзе магчымаю не толькі існаванне дысцыпліны тэалогія рэлігіі, але нават само акадэмічнае вывучэнне рэлігіі, бо ўсё будзе зведзена да дысцыплін у галіне псіхалогіі. Заўсёды варта сабе прыгадваць, што акадэмічны курс выкладання не павінен па сваёй істоце быў напоўнены каштоўнасным падыходам, бо нашыя ўласныя погляды могуць замінаць агульнамі кірунку даследванняў і падачы матэрыялу. Педагагічны дыяпазон мусіць адрознівацца ад вузканакіраванага прадстаўлення ўласных пазіцый менавіта як мага больш шырокім рэтраспектыўным поглядам на праблематыку НРР, новых ды альтэрнатыўных рэлігій, які толькі можа быць асягнуты.

Палемічны характар, які часта мае літаратура прысвечаная НРР, безумоўна, не можа быць адзінаю крыніцаю ведаў, што падаецца ў якасці

матэрыялаў для нашых вучняў ці студэнтаў; заўсёды варта памятаць таксама пра першакрыніцы ды матэрыялы агульна-тэарэтычнага кшталту, якія дазволяць нам сфармаваць пэўную базу аднясення, дзеля таго, каб нашыя ўласныя погляды не замінали падчас выкладання найбольш дыскусійных аспектаў з жыцця новых рэлігій.

Працуючы ў канфесійнаарыентаваных навучальных установах цяжкім можа быць на першы погляд фармаванне зусім нейтральнага і аб'ектыўнага дыскурсу на дадзеную праблематыку. Тым не меней, памятаючы пра тое, што знаёмае можа хутка перайсці ў аддаленае, таксама й аддаленае можа неўзабаве стаць знаёмым. Менавіта такую задачу мы павінны ставіць перад сабою, калі сапраўды прагнем асягнуць Праўду, якую шукаем. Бо выключна ад таго, які вобраз Царквы, тэалогіі і чалавека мы носім у сабе, – казаў Бэнэдыкт XVI, – такім будзе наш вобраз рэлігіі, такім будзе наш адказ на пытанне «Кім ёсьць Бог?» [26, с. 436].

1. Панин С. А. Религиоведческая экспертиза в России: проблемы и перспективы / С. А. Панин, М. В. Козлов // Религиоведение. — 2016. — № 1. — С. 77–109.
2. Smith J. Z. Imagining Religion: From Babylon to Jonestown / J. Z. Smith. — Chicago ; London : The University of Chicago Press, 1982. — 180 p.
3. Heymann P. B. Recommendations of Experts for Improvements in Federal Law Enforcement After Waco / P. B. Heymann. — Washington : U.S. Department of Justice, 1993.
4. Schmalz M. Scientology and Catholicism do mix a note on teaching new religions in a Catholic classroom / M. Schmalz // Teaching Theology and Religion. — 2006. — Vol. 9, № 1. — P. 29–36.
5. Zwoliński A. Drogami sekt / A. Zwoliński. — Radom : Polwen, 2005. — 335 s.
6. Steyn H. C. New Religious Movements, Cults, New Age and related Phenomena / H. C. Steyn. — Pretoria : University of South Africa, 2013. — 77 p.
7. Saliba J. A. Perspectives on New Religious Movements, Religious Studies: Bloomsbury Academic Collections / J. A. Saliba. — London ; Oxford ; New York ; New Delhi ; Sydney : Bloomsbury Academic, 2016. — 256 p.
8. Таова А. Контракт на тысячу лет / А. Таова // Горянка. — 2007. — 20 июня. — С. 12.
9. Urban H. B. The Church of Scientology: A History of a New Religion / H. B. Urban. — Princeton ; Oxford : Princeton University Press, 2011. — 280 p.
10. Wakefield M. Understanding Scientology: the Demon Cult / M. Wakefield. – Raleigh : lulu, 2010. – 318 p.

11. Баркасов С. Духовный «гербалайф» / С. Баркасов // Не улетай. — 2012. — № 83 (112). — С. 13.
12. Пятиминутный путеводитель по…сайентологии // Esquire. — 2013. — № 66. — С. 66–67.
13. Павлов А. «Южный Парк», мультипликационные войны и современная политическая философия / А. Павлов // Логос. — 2012. — № 2 (86). — С. 160–177.
14. Parvin S. F. The Gospel According to the Simpsons: Bigger and Possibly Even Better / S. F. Parvin, M.-I. Pinsky. — Louisville : Westminster John Knox Press, 2007. — 317 p.
15. Паничев А. М. Абсолют и человек / А. М. Паничев, А. Н. Гульков. — М. : ИД Фолиум, 2012. — 342 с.
16. Hubbard L. Ron. Scjentologia: Podstawy myśli / L. Ron. Hubbard. — Glostrup : New Era Publications International ApS, 2009. — 232 s.
17. Ионе В. И. Человек в религиозных практиках Церкви саентологии / В. И. Ионе // Вестник Полоцкого Государственного Университета. — 2008. — № 7. — С. 95–103. — (Сер. А : Гуманитарные Науки. Философия).
18. Melton J. G. Encyclopedic Handbook of Cults in America / J. G. Melton. — New York ; London : Routledge, 2013. — 424 p.
19. Behar R. The Thriving Cult of Greed and Power: special report / R. Behar // Time Magazine. — 1991. — 6 May. — 50 p.
20. Hood Jr. R. W. Another Epistemic Evaluation of Freud's Oedipal Theorz of Religion / Jr. R. W. Hood // B. Beit-Hallahmi. Psychoanalysis and Theism: Critical Reflections on the Grűnbaum Thesis. — Lanham ; Boulder ; New York ; Toronto ; Plymouth : Jason Aronson, 2010. — P. 135–154.
21. Ritter K. Righteous Religion: Unmasking the Illusions of Fundamentalism and Authoritarian Catholicism / K. Ritter, C. O'Neill. — London ; New York : Routledge, 2014. — 212 p.
22. Costello S. J. Hermeneutics and the Psychoanalysis of Religion / S. J. Costello. — Bern : Peter Lang, 2010. — 245 p.
23. Отто Р. Священное. Об иррациональном в идее божественного и его соотношения с рациональным / Р. Отто ; пер. с нем. А. М. Руткевич. — СПб. : АНО «Изд-во С.-Петерб. ун-та», 2008. — 272 с.
24. Arweck E. Researching New Religious Movements: Responses and Redefinitions / E. Arweck. — London ; New York : Routledge, 2006. — 464 p.
25. Keating K. Catholicism and Fundamentalism: The Attack on «Romanism» by «Bible Christians» / K. Keating. — San Francisco : Ignatius Press, 1988. — 360 p.
26. Szymik J. Obraz Boga w teologii Josepha Ratzingera/Benedykta XVI / J. Szymik // Śląskie studia historyczno-teologiczne. — 2011. — T. 44, № 2. — S. 435–449.